**УДК 340.12**

# КАНСЕРВАТЫЗМ ЯК АЛЬТЭРНАТЫВА БАЛЬШАВІЗМУ, НАЦЫЯНАЛІЗМУ І ДЭМАКРАТЫІ Ў ТВОРАХ МАРЫЯНА ЗДЗЯХОЎСКАГА

***канд. юрыд. навук, дацэнт Д.В. ШЧЭРБІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Прысвечаны вывучэнню філасофскіх, грамадскіх і палітычных думак прафесара М. Здзяхоўскага. У ім вылучаюцца асноўныя для аўтара ідэі рэгрэса грамадства, узаемасувязі духоўнай і палітычнай сфер яго жыццядзейнасці, негатыўныя з'явы секулярызацыі і матэрыялізацыі жыцця чалавека. Разглядаюцца погляды аўтара на кансерватызм як альтэрнатыву адмоўным праявам і наступствам ідэалогій лібералізму, дэмакратыі, бальшавізму і нацыяналізму.*

**Уводзіны.** Крызіс заходняй цывілізацыі, які праяўляецца ў крызісных з'явах у развіцці права, функцыянаванні сістэмы падзелу ўлады, рэалізацыі прынцыпаў дэмакратыі, правоў чалавека, актуалізуе асмысленне ідэйных падмуркаў ліберальнай дэмакратыі, праграм сацыяльнай справядлівасці, іх крытычнае асэнсаванне. Праблемы дэмакратыі, сацыялізму актыўна абмяркоўваліся ў часы заваёвы імі палітычнай улады, асаблівым чынам, у пачатку XX стагоддзя. Вялікую цікавасць выклікае ў дадзеным шэрагу творчая спадчына філосафа з міравым імем, славіста, філолага, публіцыста, сябра польскай Акадэміі навучання (у будучым – Польская акадэмія навук) і Венгерскай акадэміі навук, прафесара Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў), прафесара і рэктара Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя, – Марыяна Здзяхоўскага. Яго творчы шлях прыйшоўся на часы, калі ў трыдцатыя гады на землях Заходняй Беларусі, як і ў цэлым ІІ Рэчы Паспалітай Польскай, ішла ідэйная барацьба прадстаўнікоў ліберальнага, дэмакратычнага, нацыяналістычнага і бальшавіцкага накірункаў. Акрамя актыўнага навуковага жыцця ён быў моцна заангажаваны ў палітыку. Так, у траўні 1926 г. М. Здзяхоўскі нават быў адным з кандыдатаў маршала Ю. Пілсудскага на пасаду Прэзідэнта ІІ Рэчы Паспалітай Польскай, але адмовіўся ад прапановы.

Марыян Здзяхоўскі паходзіў з шляхецкага роду і нарадзіўся ў Мінскім павеце 30 траўня 1861 г., або ў в. Навасёлкі, або ў Ракаве. Адукацыю атрымаў у расійскай Мінскай гімназіі, потым працягваў у Санкт-Пецярбургскім і Тартускім універсітэтах, дзе і распачалася яго навуковая кар'ера.

Па меркаваннях даследчыкаў, М. Здзяхоўкі ўяўляў сабой тып «краёўца» [17]. Ён заўседы «больш гарнуўся да родных мясцін, чым да этнаграфічнай Польшчы» [18]. Яго самаідэнтыфікацыя як паляка, хутчэй адпавядала ўжо знікаючай у тыя часы ідэнтыфікацыі з гістарычнай Рэччу Паспалітай, аб чым сведчыць яго знакамітае выказванне: «І калі б мяне сёння запыталі, кім у глыбіні сэрца сябе адчуваю, адказаў бы, што адчуваю сябе грамадзянінам Вялікага княства Літоўскага, неразарвальнай Уніяй звязанага з Польшчай. Калі бачу на Замкавай гары лунаючы сцяг з арлом, але без пагоні, то ўспрымаю гэта, як крыўду мне нанесеную» [5, с. 3].

Народжаны на памежжы цывілізацый, аўтар стаў тым мастом між Захадам і Усходам, які дазваляў ім спасцігаць здабыткі адзін аднаго. М. Здзяхоўскі напісаў дзясяткі прац, дзе даследаваў асаблівасці рускай культуры, філасофскай, рэлігійнай і палітычнай думкі, завязаў знаёмствы і перапіску з выбітнымі рускімі мыслярамі Л. Талстым, Д. Меражкоўскім, Я. Трубяцкім і інш., здолеў азнаёміць з іх думкамі польскую і заходнееўрапейскую інтэлігенцыю. У сваю чаргу, да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі, ён друкаваў у расійскай прэсе шматлікія артыкулы, прысвечаныя асаблівасцям і ідэйным пошукам польскіх філосафаў. Фактычна ўся спадчына М. Здзяхоўскага прасычана ўзаемаўплывамі заходнееўрапейскай, заходне- і ўсходнеславянскіх культур. Магчыма, таму яму былі блізкія каталіцкі традыцыяналістычны апакаліптызм Захаду і песімістычны катастрафізм Усходу.

**Асноўная частка.** М. Здзяхоўскага адносяць да тых выбітных мысліцеляў, якія на пераломе XIX і XX стагоддзяў, песімістычна ставілі адмоўны дыягназ развіццю заходняй цывілізацыі, бачылі яе заняпад і прадказвалі надыход страшэнных грамадскіх катастроф [1]. Як і іншыя кансерватыўныя аўтары, такія як О. Шпэнглер, М. Бярдзяеў, Хосэ Артэга-і-Гассэт, ён бачыў пагрозу грамадству ў вызваленні чалавека ад усялякіх, у тым ліку маральных, абмежаванняў, у эмансіпацыі чалавечага розуму. Укаранёныя ў натуру чалавека рамантычныя праявы яго "я", што фарміруюцца пад уплывам яго пажадлівасці, пыхі [2, с. 223] найбольш расквечваюцца ў эпоху Рэнесансу і выражаюцца ў панаванні індывідуалізму і гуманізму. Менавіта ў гэты час ідэі іманентнага Бога, што ўзніклі яшчэ ў сярэднявечных хрысціянскіх вучэннях, прывялі да свайго лагічнага фіналу – абагаўлення чалавека [8, с. 3–4].

Ад Рэнесансу распачынаецца ўзрастанне духа крытыцызму. У сваёй працы "Рэнесанс і рэвалюцыя" Здзяхоўскі адзначае паступовасць дадзенага працэсу. "Спачатку вера ў чалавека без думкі пра Бога і аб сувязі яго з Богам, потым нарэшце вера ў чалавека, які супрацьпастаўляе сябе Богу, які выціскае з сябе думку аб ім і які сам вынішчае ў сабе вобраз і падабенства Божае" [11].

Ад Адраджэння праз прыстанак Французскай рэвалюцыі гэтыя ідэі прыйшлі да свайго лагічнага ўкаранавання ў ідэалогію бальшавізму [12, с. 197]. Распачатае Рэнесансам адарванне чалавека ад Бога

працягвалася яго вызваленнем ад повязяў “рэлігіі, потым дзяржавы і грамадства, потым (тут аўтар фактычна заглядвае ў будучыню, у XXI ст.) сям’і” [12, с. 108].

У сваіх шматлікіх працах М. Здзяхоўскі прасочвае як гэтыя быццам бы высакародныя ідэі вольнасці ў праўна-палітычнай сферы прывялі ад лібералізму, праз дэмакратыю – да таталітарызму [4, с. 104; 6, с. 27–28; 12, с. 110]. Этатызм, паводле М. Здзяхоўскага, ёсць аб’ектыўны вынік дэмакратызму, а значыць і лібералізму [12, с. 111]. Яго ўзрастанне, пашырэнне паўнамоцтваў дзяржавы, сфер яе ўмяшання, і тут Здзяхоўскі пагаджаецца з Рэйнальдам [12, с. 111], нязменна прыводзіць да згубы яе аўтарытэту, яна становіцца аб’ектам усеагульнай нянавісці і скончвае або анархіяй, або тыраніяй.

Бальшэвізм, для М. Здзяхоўскага, – гэта не проста канчатковая стадыя прагрэсу, ды найвышэйшы прадукт дэмакратычнай думкі, гэта з’ява эсхаталагічная ды метафізічная. Такое бачанне збліжае М. Здзяхоўскага з вядомымі расійскімі аўтарамі М. Бярдзяевым, Д. Мераждкоўскім, Я. Трубяцкім, У. Салаўёвым і інш. Бо тое, што адбываецца ў Расіі, для аўтара, гэта не проста захоп улады “горсткай нягоднікаў”, хай сабе і вельмі рашучых, з каласальнай энергіяй, што трымаюцца толькі тэрорам [3, с. 54–55], гэта “моц, новае Credo, новы Закон, новая рэлігія” [7, с. 154].

Падаецца, што мэты бальшавіцкай рэвалюцыі нерэальныя, бо яна спрабуе знішчыць уласнасць, што значыць змяніць прыроду чалавека [4, с. 106]. Бальшавікі не знішчылі ўласнасць, яны фактычна перадалі яе дзяржаве, збудаваўшы “дзяржаўны капіталізм”, які асноўваецца на адноўленай “паншчыне” [4, с. 108]. Аднак за справай змяніць чалавека, ператварыць яго ў машыну, пазбавіць духоўнай прагі Нябесаў, стаіць нешта большае, “дэманічнае” [14, с. 228]. Бо як інакш, паўтарае аўтар за Мераждкоўскім, патлумачыць тое, што падобныя “механістычныя” ідэі не выклікаюць агіды ў людзей, а наадварот прыцягваюць іх у жаданні пазбыцца свайго “я”, выклікаюць прагу да абязлічвання [4, с. 110].

Адзінай альтэрнатывай бальшавізму ў сучаснасці, падаецца, выступае нацыяналізм. Аднак, узнікшы ў эпоху Рэфармацыі падчас распаду хрысціянскага свету, атрымаўшы моц пасля 1848 г. і расквітнеўшы пасля Версальскага міру, нацыяналізм фактычна пазычае ў свайго ворага яго этатыстычныя мэты і метады [12, с. 116]. Сягаючы нізшых інстынктаў чалавека, паводле М. Здзяхоўскага, нацыяналізм сее нянавісць і варожасць у палітычным жыцці народа [6, с. 29], прыводзіць яго да адзяржаўленай закасцянеласці [15, с. 100].

Сапраўднай процівагай бальшавізму можа быць толькі кансерватызм: “толькі адно ёсць дакладным і неабходным, што супраць рэвалюцыі і яе разбурэнняў выходзіць патрэбна з контррэвалюцыяй, але абсалютнай, або такой, што магла б выкрэсліць з сябе ўсялякія пачаткі, якія маюць хоць якія-небудзь сувязі з рэвалюцыяй” [12, с. 107]. Кансерватызму аўтар прысвячае такія свае працы, як “Кансерватызм і дэмакратыя”, “Пачатак захаваўчы ў ідэі ўкраінскай” [6; 9], неаднаразова звяртаецца ў іншых сваіх работах.

Кансерватызм, паводле М. Здзяхоўскага, ня ёсць нейкая “неразумная рэакцыя”. Наадварот, кансерватыўная пастава не выступае супраць рэформ, часам як раз захаваўчыя арганізацыі ініцыявалі найбольш прагрэсіўныя грамадскія змены. Аднак апошнія трэба заўжды ўзгадняць з традыцыямі і сумленнем, “асвятляць святлом Дэкалогу і Евангелля” [6, с. 29].

Марыян Здзяхоўскі адзначае, што ў натуры чалавека ляжыць прывязанне да традыцый рэлігійных і народных, і кожнае нармальнае грамадства павінна будавацца на іх падмурку [8, с. 15–16]. Аўтар пагаджаецца з В. Ліпінскім і У. Залозецкім, што і вера, і ідэя захаваўчая вынікаюць з інстынктыўнага для чалавека прагнення: рэлігія – з укаранёнай у душы чалавека патрэбы падтрымкі звышнатуральных сіл ў цяжкім змаганні за індывідуальнае і супольнае дабро; кансерватызм – з прыроджанага інстынкту, які наказвае захоўваць і перадаваць будучым пакаленням усё, што было здаровым і моцным у мінулым і тым самым павінна служыць як падстава для далейшага развіцця [9, с. 163–164].

Услед за Фостэрам ён адзначае, што толькі там, “дзе ў душах грамадзянаў пануе Антыгона”, то бок, дзе адвечны маральны божы закон стаіць вышэй за чалавечае пазітыўнае права, толькі тое грамадства будуецца на падвалінах грамадскага і дзяржаўнага парадку [6, с. 29].

Выратаванне можа быць толькі ў духоўным адраджэнні, выхаванні людзей, прасякнутых свядомасцю свайго грамадскага абавязку, якое па сутнасці ёсць вера ў абсалютнае Дабро або Бога. Ён прыводзіць словы Караля Сэкрэтэна: “Шукаем істоты дасканалай, прагнем яе і патрабуем, вера ў дасканалую Істоту *ўтрымае нас і створыць”* [6, с. 28]. На думку М. Здзяхоўскага неабходна вяртацца да першапачатку, да Бога, хрысціянскай канцэпцыі, што бачыць у чалавеку не толькі біялагічны феномен, але служыць надпрыродным мэтам [12, с. 120]. Спробам марксісцкага матэрыялізму ператварыць чалавека ў жывёлу, збэсціялізаваць яго, неабходна супрацьпаставіць духоўную ідэю, якая бачыць у чалавеку чалавека, то бок істоту, якая нясе ў сабе вобраз і падабенства Бога [6, с. 29]. Усе свае сілы сапраўдныя кансерватары павінны прыкласці дзеля абароны такой ідэі.

Мэтай кансерватызму з’яўляецца спалучэнне патрабаванняў прагрэсу з прывязаннем да прыгажосці мінулага, або традыцыі. Толькі ў гэтым выпадку будзе забяспечвацца здаровае існаванне грамадства [13, с. 86]. Сярод элементаў традыцыі грамадства былой Рэчы Паспалітай М. Здзяхоўскі ў розных сваіх працах называе моцную ўладу, месіянства, уласнасць, сям’ю і, зноў жа, хрысціянскую веру.

Існаванне духоўных падмуркаў, сама канцэпцыя хрысціянства, патрабуе існавання аўтарытэта, які будзе стаяць на варце Права Божага: “адно з двух: або аўтарытэт духовы, або прымус фізічны; што лепш: лад, які будуецца зверху, ці та страшэнная арганізацыя, якая з долу хапае ў свае клешчы, “рацыяналізуе”, “стандартызуе”, пагражае забойствам духа” [12, с. 120]. У іншым месцы М. Здзяхоўскі адзначае, што сама традыцыя народу ўвасабляецца ў канкрэтных імёнах вялікіх духовых лідараў, правадыроў народа [13, с. 86]. З вялікай скрухай аўтар адзначае, што нешматлікія галасы аб усталяванні ў Польшчы манархічнага ладу пасля атрымання незалежнасці сустрэлі варожасць і абвінавачванне ў ледзьве не здрадзе [16, с. 19]. Але ж манархія – то найадпаведнейшая форма кіравання для Польшчы, якая звязвае сучаснасць з мінулым, дае найлепшыя гарантыі, чым іншыя формы, што ўрад будзе панадпартыйны, справядлівы, моцны [16, с. 19].

Аўтар адзначае вялікую важнасць манархічнага прынцыпу для існавання кансерватызму, а значыць і народа. Без манарха ўселякі манархізм няўхільна разкладаецца і занепадае, выраджаецца ў найгоршую і найбязглуздзейшую з дэмакратычных партый, якая дзеля здабыцця прыхільнасці прыбягае да дапамогі найнізшых інстынктаў. Дэмакратычны і рэспубліканскі кансерватызм звяртаецца да дзікага “ўрапатрыятызму” ў выглядзе нацыянальнага эгаізму, перш за ўсе ў постаці першабытнага жывёльнага антысемітызму [9, с. 171].

Як рэспубліка адпавядае дэмакратыі, а дыктатура – ахлакратыі, так і манархія цесна звязана з іерархічным класакратычным грамадскім ладам. Услед за В. Ліпінскім, погляды якога Здзяхоўскі даследваў, ён адзначае, што класакратыя – гэта лад, пры якім грамадскія класы знаходзяцца ў гармоніі, павязаныя імператывам самаабмежавання на агульную карысць і супольнымі повязямі рэлігіі, маралі і права [9, с. 165]. Рэлігія і спадчынная манархія выступаюць формамі самаабмежавання класаў. Манарх, што ўзвышаецца над усімі, ёсць чыннік раўнавагі ў грамадстве, менавіта ён вядзе дзяржаву шляхам арыстакратызацыі, узвышаючы людзей паводле заслуг [9, с. 165–164].

Наступным элементам кансерватыўнага быцця народа з’яўляецца выкананне ім місіі. Спрадвечна, як лічыць аўтар, Рэч Паспалітая служыла мурам хрысціянства. Яна бараніла Еўропу ад татараў, туркаў, потым царскай Расіі і, як лічыць аўтар, дадзеную місію яна павінна выконваць і ў дачыненні да бальшавізму. Зараз жа, са скрухай адзначае М. Здзяхоўскі, місію народа звялі да бездарожжа шавінізму [13, с. 86].

Як раз нацыянальным шавінізмам адрозніваюцца вонкі падобныя кансерватызм і нацыяналізм. І калі першы будуецца на сапраўдным патрыятызме, арганічным разуменні народа, то другі фактычна іх адмаўляе. Гаслам “народ” нацыяналісты гіпнатызуюць шырокія масы, пятнаюць імем “ненацыянальнага” усё, у чым не бралі ўдзел і не кіравалі, і тым самым шпурляюць пылаючую паходню ў палітычнае жыццё [6, с. 29]. Ідэю народа манапалізуюць нацыяналісты выключна для сябе, прымушаюць служыць сабе, ператвараюць у адзнаку палітычнай прыналежнасці. “Народ губляе ўсю прывабнасць, становіцца аб’ектам нянавісці” [9, с. 170].

Таму аўтар лічыць шкодным мажлівае знаходжаенне сярод кансерватараў людзей з нацыяналістычнымі поглядамі. Ён лічыць, што толькі як ідэя ўніверсалістычная кансерватызм можа супрацьстаяць, як таксама прэтэндуючаму на ўніверсалізм бальшавізму, так і “нацыяналістычным забабонам” [9, с. 180]. Выйсце з агульнаеўрапейскага крызісу М. Здзяхоўскі бачыць толькі ў кансерватыўным фронце народаў [9, с. 181], кансерватызме моцна ўкаранёным у рэлігію. Менавіта таму ён з’яўляўся прыхільнікам незапатрабаваных польскім урадам ідэй федэрацыі ці аўтаноміі, пабудаваных на салідарнасці насельніцтва краю без увагі на мову і вызнанне [17], прапаноўваў надаць нацыянальным меншасцям магчымасці для нацыянальна-культурнага развіцця, спрыяць развіццю іх адукацыі на нацыянальнай мове, у тым ліку не перашкаджаць, як рабілася ў тыя часы, магчымасці для выпускнікоў нацыянальных школ паступаць у польскія ўніверсітэты і г.д. [5, с. 14; 6, с. 35]. У сферы гаспадаркі ўрад павінен быў бы быць спрыяльным і справядлівым для ўсіх. Ідэал мысляра – Польшча XV ст., дзяржава, прывабная для суседзяў [5, с. 15].

Важнай каштоўнасцю для кансерватара М. Здзяхоўскага з’яўляецца і прыватная ўласнасць. Яе пачуццё ляжыць у прыродзе чалавека: “аб тое, што тое ёсць маім, а не тваім, сварацца між сабой ужо малыя дзеці” [4, с. 106].

Вельмі адмоўна ён згадвае зямельную рэформу, што праводзілі ўлады міжваеннай Польшчы. У нападках на маёмасць шляхты аўтар бачыць інтрыгу плутакратыі, вялікага капіталу, што прыйшоў да ўлады праз дэмакратыю, палітыку якога этатызм гэтай самай дэмакратыі прывеў да банкруцтва, і які зараз нацкоўвае народ на шляхецтва каб паспрабаваць адвесці гнеў масаў ад сваёй асобы [4, с. 107]. Экспрапрыяцыю шляхецкай зямлі, як і ўвогуле экспрапрыяцыю, аўтар лічыць “замахам на душу народа, каторы дэмаралізавалі, навучаючы, што замест працы і ашчаднасці можна дайсці да ўласнасці міласцінай і грабяжом” [6, с. 34].

Сярод падмуркаў культуры народа, кансерватызма, М. Здзяхоўскі неаднаразова называе і сям’ю [4, с. 104; 6, с. 37], і хоць няшмат пра яе разважае, але прароча ўказвае, што шлях індывідуалізму і гуманізму нязменна ідзе і да пошасці разводаў, сэксуальных рэформ [12, с. 108].

**Высновы.** Такім чынам, выратаванне Еўропы ад бэсціялізацыі і ператварэння ў таталітарную цывілізацыю машын М. Здзяхоўскі звязваў выключна з кансерватыўнай ідэалогіяй, выхаваннем грамадства ў духе хрысціянскай веры, класакратычнага манархізму, маральных каштоўнасцей, сям’і і абароны прыватнай уласнасці. І хоць спадзяванні на перамогу ў аўтара былі невялікія, – “стаім мы ў

абліччы канца гісторыі..” [10, с. VII], – але ж нязломна і з чыстым сумленнем, за прыкладам Антыгоны, кансерватары павінны бараніць свае каштоўнасці, хоць усе астатнія ўжо пахаладзелі ад страху і паніклі галовамі [6, с. 37].

ЛІТАРАТУРА

1. Dmitruk, Grz. Człowiek w obliczu końca. Mariana Zdziechowskiego wizja zagrożeń cywilizacji [Электронны рэсурс] / Grz. Dmitruk. – Рэжым доступу: http://www.konserwatyzm.pl/artykul/3728/czlowiek-w-obliczu-konca-mariana-zdziechowskiego-wizja-zagro. – Дата доступу: 15.06.2014.
2. Zdziechowski, M. Antyromantyzm i antygermanizm / M. Zdziechowski // W obliczu końca / M. Zdziechowski. – Wilno : Wydawnictwo Stanisława Turskiego, 1938. – R. IX. – S. 203–224.
3. Zdziechowski, M. Czerwony terror / M. Zdziechowski // W obliczu końca / M. Zdziechowski. – Wilno : Wydawnictwo Stanisława Turskiego, 1938. – R. III. – S. 44–106.
4. Zdziechowski, M. Dwie rewolucje / M. Zdziechowski // Od Petersburga do Leningradu / M. Zdziechowski. – Krakow : Ośrodek Myśli Politycznej, 2009. – R. XI. – S. 104–115.
5. Zdziechowski, M. Idea polską na Kresach / M.Zdziechowski // Widzmo przyszłosci. Szkize historyczno-publicystyczne / M. Zdziechowski. – Wilno, 1939. – S. 1–17.
6. Zdziechowski, M. Konserwatyzm a demokracja / M. Zdziechowski // Od Petersburga do Leningradu / M. Zdziechowski. – Krakow : Ośrodek Myśli Politycznej, 2009. – R. III. – S. 26–45.
7. Zdziechowski, M. Kryzys kultury / M. Zdziechowski // Od Petersburga do Leningradu / M. Zdziechowski. – Krakow : Ośrodek Myśli Politycznej, 2009. – R. XIV. – S. 153–171.
8. Zdziechowski, M. Masonja jej cele i ideały / M. Zdziechowski // W obliczu końca / M. Zdziechowski. – Wilno : Wydawnictwo Stanisława Turskiego, 1938. – R. I. – S. 1–38.
9. Zdziechowski, M. Pierwiastek zachowawczy w idei ukraińskiej / M. Zdziechowski // Widzmo przyszłosci. Szkize historyczno-publicystyczne / M. Zdziechowski. – Wilno, 1939. – S. 154–194.
10. Zdziechowski, M. Przedmowa / M. Zdziechowski // W obliczu końca / M. Zdziechowski. – Wilno : Wydawnictwo Stanisława Turskiego, 1938. – S. VII–XII.
11. Zdziechowski, M. Renesans a rewolucja [Электронны рэсурс] / M. Zdziechowski. – Рэжым доступу: http://www.polskietradycje.pl/article.php?artykul=108. – Дата доступу: 15.06.2014.
12. Zdziechowski, M. Tragiczna Europa / M.Zdziechowski // W obliczu końca / M.Zdziechowski. – Wilno : Wydawnictwo Stanisława Turskiego, 1938. – R. IV. – S. 107–124.
13. Zdziechowski, M. Trepiet małago pered bolszim / M. Zdziechowski // Od Petersburga do Leningradu / M. Zdziechowski. – Krakow : Ośrodek Myśli Politycznej, 2009. – R. IX. – S. 86–91.
14. Zdziechowski, M. Widmo przyszłości / M. Zdziechowski // Widzmo przyszłosci. Szkize historyczno-publicystyczne / M. Zdziechowski. – Wilno, 1939. – S. 227–132.
15. Zdziechowski, M. Z historji stosunków polsko-rosyjskich nazajutrz po wojnie światowej / M. Zdziechowski // Widzmo przyszłosci. Szkize historyczno-publicystyczne / M. Zdziechowski. – Wilno, 1939. – S. 86–112.
16. Zdziechowski, M. Ze Starego dworu / M.Zdziechowski // Od Petersburga do Leningradu / M. Zdziechowski. – Krakow : Ośrodek Myśli Politycznej, 2009. – R. II. – S. 15–25.
17. Бардах, Ю. Шматузроўневая нацыянальная свядомасць на літоўска-рускіх землях Рэчы Паспалітае ў XVII–XX ст. / Ю. Бардах [Электронны рэсурс] // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах. . – Рэжым доступу: http://kamunikat.fontel.net/www/knizki/historia/bardach/08.htm. – Дата доступу: 15.06.2014.
18. Рагойша, В. Ішлі лісты з Ракава... [Электронны рэсурс] / В. Рагойша // Кантакты : літ.-крытыч. арт., эсэ / В. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 223 с. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=21841. – Дата доступу: 15.06.2014.

*Паступіў 21.10.14*

**CONSERVATISM AS ALTERNATIVE TO THE IDEOLOGY OF BOLSHEVISM, NATIONALISM AND DEMOCRACY IN THE WORKS OF MARIAN ZDZIECHOWSKI**

***D. SHCHERBIK***

*In the scientific article studies political doctrine of prof. Marian Zdziechowski. The publication identifies the main ideas of the author about the spiritual decline of the society, the relationship of the spiritual and political spheres of its life, the negative effects of secularization and materialization of human life. The article deals with the author's views on conservatism as an alternative to the negative effects and consequences of ideologies of liberalism, democracy, bolshevism and nationalism.*